# Пройдуць чытанні

**Восьмыя Гарадзенскія чытанні пройдуць 12 верасня ў абласной бібліятэцы імя акадэміка Карскага.**

Аб гэтым паведаміла загадчык аддзела краязнаўства Любоў Турмасава. Чытанні прысвячаюцца 470-годдзю з часу заснавання «Літоўскай капэлы» ў Гродне. Гэта адзін з найбольш ранніх аркестравых калектываў Беларусі.

Удзельнікі канферэнцыі абмяркуюць наступныя тэмы: «Музычная капэла на Гродзеншчыне: вытокі і развіццё»; «Музычная культура Гродзеншчыны: гісторыя і сучаснасць»; «Развіццё музычнай адукацыі на Гродзеншчыне».

Паслухаць даклады змогуць усе жадаючыя. Афіцыйнымі мовамі канферэнцыі будуць беларуская, руская і польская.

**Аксана САВАШЫНСКАЯ.**